# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

19 снежня 2025 г. № 443 г.Мінск

Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1. За выдатныя дасягненні ў галіне музычнага, тэатральнага і кінамастацтва, дэкаратыўна-прыкладнога і харэаграфічнага мастацтва, бібліятэчнай справы, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2025 года:

Жаравай Тамары Рыгораўне, выкладчыку дзяржаўнай установы адукацыі ”Рэспубліканская гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі“, – за асабісты ўклад у развіццё і папулярызацыю нацыянальнага музычнага мастацтва, падрыхтоўку лаўрэатаў міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў;

заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь узорнаму ансамблю танца ”Чабарок“ установы адукацыі ”Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі“ – за вялікі ўклад у захаванне і развіццё традыцый харэаграфічнага мастацтва, актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці краіны;

калектыву выкладчыкаў установы адукацыі ”Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя М.К.Агінскага“ ў складзе Валковіч-Борыс Людмілы Мікалаеўны, Чырвонцавай Лізаветы Львоўны – за значны асабісты ўклад у адраджэнне, зберажэнне і развіццё традыцый Маладзечанскай школы выцінанкі;

калектыву дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы ”Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь“ – за значны ўклад у патрыятычнае выхаванне, стварэнне творчага праекта ”Патэтычны дзённік памяці“;

калектыву дзяржаўнай установы ”Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь ”Брэсцкі тэатр лялек“ – за значны ўклад у захаванне нацыянальных духоўных традыцый, папулярызацыю маральных каштоўнасцей сродкамі тэатральнага мастацтва;

калектыву дзяржаўнай установы культуры ”Мастоўская раённая бібліятэка“ – за значны ўклад у патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення праз рэалізацыю інавацыйнага літаратурнага праекта ”Кнігі будуюць МАСТЫ“;

лейтэнанту міліцыі Благавай Ганне Анатольеўне, салісту духавога аркестра галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама, – за асабісты ўклад у развіццё сучаснага музычнага мастацтва, стварэнне песень патрыятычнай тэматыкі;

Мартынюку Андрэю Міхайлавічу, майстру народных мастацкіх рамёстваў аддзела рамеснай дзейнасці дзяржаўнай установы ”Дзяржынскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці“, – за выдатныя дасягненні ў галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, стварэнне ўнікальнай тэхналогіі вырабу механічных гадзіннікаў з дрэва;

Пагарэлай Ксеніі Максімаўне, артысту-салісту-інструменталісту канцэртнага аддзела філіяла ”Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора“ навукова-даследчай і асветнай установы культуры ”Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік“, – за значны асабісты ўклад у прапаганду беларускай музычнай спадчыны, развіццё арганнага выканальніцтва;

Яфрэмаву Аляксандру Васільевічу, мастацкаму кіраўніку заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь тэатра-студыі кінаакцёра рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства ”Нацыянальная кінастудыя ”Беларусьфільм“, – за вялікі асабісты ўклад у развіццё і папулярызацыю беларускага тэатральнага і кінамастацтва.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць у 2026 годзе выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2025 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы спецыяльных прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад падаходнага падатку з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМІНІСТРАЦЫЯ ПРЭЗІДЕНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ • 1 •
Для правовых актов

10